*Хочаце быць у курсе ўсіх падзей? Афармляйце **перадаплату** за нумары «Народнай волі» першай паловы 2008 года*

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою…
Якуб КОЛАС

№№193–194 (2713–2714)

6 снежня 2007 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

Да ўвагі!

Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Шаноўныя чытачы!

Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 328-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 328-68-71.

ВАШЫНГТОН—МІНСК

Кандаліза Райс сустрэлася з прадстаўнікамі беларускай апазіцыі

Днямі кіраўніца знешнепалітычнага ведамства ЗША **Кандаліза РАЙС** прыняла групу беларускіх апазіцыянераў. Прэс-служба Дзярждэпартамента ЗША паведамляе, што падчас сустрэчы абмяркоўваліся шляхі выкарыстання "ўстойлівасці і еднасці" беларускай апазіцыі для дасягнення дэмакратыі ў Беларусі. У склад беларускай дэлегацыі былі ўключаны сем апазіцыянераў.

Дзяржсакратар ЗША пацвердзіла падтрымку з боку ЗША "дэмакратычных памкненняў беларускага народа і падкрэсліла, што ЗША будуць працягваць выступаць у абарону свабоды ў Беларусі".

У склад беларускай дэлегацыі, якая сустракалася ў Вашынгтоне з дзяржсакратаром ЗША, увайшлі экс-кандыдат у прэзідэнты **Аляксандр МІЛІНКЕВІЧ**, старшыня апазіцыйнай Партыі камуністаў Беларускай **Сяргей КАЛЯКІН**, лідэр Аб'яднанай грамадзянскай партыі **Анатоль ЛЯБЕДЗЬКА**, заснавальнік апазіцыйнага руху "Малады фронт" **Павел СЕВЯРЫНЕЦ**, а таксама актывісты беларускай апазіцыі **Эніра БРАНІЦКАЯ** і **Дзмітрый ФЕДАРУК**.

Кандаліза Райс з прадстаўнікамі беларускай апазіцыі (у кадр не трапілі Павел Севярынец і Дзмітрый Федарук).

НАДВОР'Е

Новы год будзе цёплым?

Як паведамляюць сіноптыкі, не толькі на гэтым, але і на наступным тыдні ў Беларусі будзе не зусім зімовае, цёплае надвор'е.

Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, удзень — ад 2 марозу да 4 цяпла. Ападкі будуць назірацца ў выглядзе дажджу і мокрага снегу.

Напрыканцы другой дэкады снежня на тэрыторыю нашай краіны завітае халоднае арктычнае надвор'е, калі ападкі будуць назірацца ў выглядзе снегу і мокрага снегу. Тэмпература паветра ўначы ад 0 да 6 марозу, пры праяснеццях да мінус 10 градусаў, удзень — ад мінус 4 градусаў да 1 цяпла.

А ў апошнія дні снежня нас чакае чарговае павышэнне тэмпературы паветра. Уначы тэмпература паветра будзе вагацца ад 5 марозу да 1 градуса цяпла, удзень — ад мінус 2 да плюс 3 градусаў. Так што Новы год можа быць з адлігай.

ЧУЛІ?

Чавес прайграў…

У нядзелю, 2 снежня, у Венесуэле прайшоў рэферэндум. Прапанаваныя Чавесам змяненні, якія адмяняюць, у прыватнасці, абмежаванні на перавыбранне аднаго і таго ж чалавека на пасаду прэзідэнта, падтрымалі толькі 49,29% удзельнікаў рэферэндуму.

Большасць грамадзян Венесуэлы прагаласавалі супраць канстытуцыйнай рэформы прэзідэнта краіны Уга Чавеса, якая, калі б была прынята, пашырыла б прэзідэнцкія паўнамоцтвы. Паводле даных Нацыянальнага выбарнага савета Венесуэлы, 50,7% венесуэльцаў не падтрымалі адпаведныя папраўкі ў Канстытуцыю краіны.

Усяго Чавес прапаноўваў унесці ў Канстытуцыю краіны 33 змяненні. У прыватнасці, ён хацеў, каб цэнтральны банк краіны падпарадкоўваўся яму, а таксама меў намер стварыць новыя правінцыі, якія б падпарадкоўваліся цэнтру, і ўрэзаць правы мясцовага самакіравання.

Чавес таксама прапанаваў урэзаць працоўны дзень да шасцігадзіннага і абвясціць 16 гадоў узростам, які дае права на ўдзел у выбарах, замест 18, як гэта было раней.

Як паведаміла старшыня Нацыянальнага выбарнага савета **Цібісай Лусена**, у галасаванні ўзялі ўдзел каля 16 мільёнаў чалавек. Усенародны рэферэндум прайшоў спакойна, сур'ёзных парушэнняў не адзначана, перадало РІА "Новости".

Фота AFP

КОРАТКА

Уганараванне Мілінкевіча

У Варшаве падчас адкрыцця навучальнага года ў Акадэміі маладых дыпламатаў Аляксандр Мілінкевіч быў уганараваны ўзнагародай імя Казімежа Пуласкага "Рыцар Свабоды".

У час урачыстай цырымоніі А.Мілінкевіч атрымаў копію афіцэрскай шаблі з часоў генерала Пуласкага з надпісам "Рыцар Свабоды — доктар Аляксандр Мілінкевіч".

Спадар Мілінкевіч падзякаваў фундацыі імя Пуласкага і Акадэміі за гонар і падкрэсліў, што Польшча, як ніводная іншая краіна свету, адчуваючы гістарычныя сувязі з Беларуссю, дапамагае цяпер беларусам у барацьбе за дэмакратыю.

Такія вось правы…

Пікет у Віцебску, прысвечаны Міжнароднаму дню правоў чалавека, які адзначаецца ва ўсім свеце 10 снежня, праводзіць забаронена. Пра гэта стала вядома заяўніку акцыі, кіраўніку Віцебскай філіі ГА "Беларускі Хельсінкскі камітэт" Паўлу Левіну з адказу намесніка старшыні Віцебскага гарвыканкама Паўла Лосіча.

Прычына адмовы традыцыйная і банальная: у Віцебску, як, дарэчы, і ў многіх іншых гарадах Беларусі, мясцовыя ўлады вызначылі пляцоўку для правядзення масавых грамадскіх акцый у самым малалюдным і аддаленым месцы — у парку Мазурына, а фактычна ў лесапарку на ўскрайку абласнога цэнтра. Усе астатнія варыянты нават не разглядаюцца.

Ван дэр Ліндэн заступіўся за «марозаўскіх»

Старшыня Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы (ПАСЕ) Рэнэ ван дэр Ліндэн заклікаў улады Беларусі адмяніць смяротныя прысуды Сяргею Марозаву, Ігару Данчанку і Валерыю Гарбатаму, якія былі ў 2006 годзе асуджаны Вярхоўным судом да расстрэлу.

Пра гэта гаворыцца ў заяве кіраўніка ПАСЕ, распаўсюджанай прэс-службай Савета Еўропы.

"Заклікаю прэзідэнта Лукашэнку неадкладна адмяніць смяротныя прысуды", — заявіў старшыня ПАСЕ. Нагадаўшы пра тое, што смерць неправасудная, ён звярнуўся да Аляксандра Лукашэнкі з заклікам увесці мараторый на пакаранне смерцю ў Беларусі, што стала б выразным і рашучым крокам да збліжэння краіны з Саветам Еўропы.

Трэнер асуджаны

На два гады пазбаўлення волі асуджаны трэнер баранавіцкай дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы, які пакінуў дзяцей без нагляду ў аздараўленчым лагеры.

За час яго адсутнасці быў смяротна траўміраваны 11-гадовы хлопчык — на яго ўпала судзейская вышка на тэніснай пляцоўцы.

АД РЭДАКЦЫІ

На якія думкі наводзяць вынікі галасавання ў Венесуэле?

Калі рэферэндум праводзіць адкрыта, хоць з мінімальным захаваннем дэмакратычных працэдур, то волевыяўленне людзей не заўсёды будзе такім, на якое разлічвае дыктатар.

Калі дзяржава ідзе на рэферэндум, яна павінна ўзяць усю адказнасць за правядзенне яго па дэмакратычных правілах, — менавіта такой пазіцыі прытрымліваўся Віктар Ганчар.

Венесуэльцы абмежавалі тэрмін прэзідэнцкіх паўнамоцтваў Уга Чавеса. І для дыктатара гэта сур'ёзны званок.

Венесуэльскі рэферэндум нагадвае нам, беларусам, пра плебісцыты, якія некалькі разоў праводзіў А.Лукашэнка. Іх вынікі (тыя, якія былі афіцыйна агучаны) прымушаюць сур'ёзна задумацца. Памятаеце пытанне аднаго з першых рэферэндумаў: ***"Согласны ли Вы, что финансирование всех ветвей власти должно осуществляться гласно и только из государственного бюджета?"***. Ці ж не смехатура, што амаль 66 працэнтаў удзельнікаў рэферэндуму быццам прагаласавалі **супраць** таго, каб фінансаванне ўсіх галін улады адбывалася галосна і толькі з дзяржаўнага бюджэту? Што, плаціць міністрам можна з-пад крыса? І пры гэтым не брать грошы з бюджэту?

А як вырашалася пытанне з сімволікай? З зацвярджэннем дзвюхмоўя? З магчымасцю балатавацца на трэці тэрмін прэзідэнцтва адной і той жа асобе?

Калі дзяржава ідзе на рэферэндум, яна павінна ўзяць усю адказнасць за правядзенне яго па дэмакратычных правілах. Менавіта да гэтага, памятаецца, і заклікаў Віктар Ганчар, тагачасны старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі. Шкада, вельмі шкада, што яго прынцыповасць каштавала яму жыцця.

Беларусь Tomorrow

Напішы, што думаеш, і з'ездзі ў Еўропу!

Калі табе да 26 гадоў і ты не абыякавы да будучыні Беларусі, то напішы эсэ і адпраў на электронны адрас ***belradio@mail.ru***

Што пісаць?

Абяры адну з шасці тэм або можаш пісаць па кожнай:

1. Нацыянальная ідэя
2. Высокія тэхналогіі
3. Адукацыя
4. Культура
5. Знешняя палітыка
6. Палітычны лад краіны

Колькі часу на роздум?

На напісанне эсэ даецца час да 20 снежня. Прадугледжаны памер працы — не больш за 2000 знакаў. Тэматыка у межах буйной тэмы (напрыклад, адукацыя) можа быць якой заўгодна, ад плана для канкрэтнага універсітэта да глабальнай ацэнкі сістэмы адукацыі.

Усе працы выстаўляюцца на старонку конкурсу на сайце *www.belradio.fm*. За кожную можа галасаваць інтэрнет-аўдыторыя.

А суддзі хто?

У якасці суддзяў выступяць вядомыя эксперты ў розных галінах (па адным на кожную тэму).

У іх склад увайшлі:

Сяргей ПАНЬКОЎСКІ — кандыдат філасофскіх навук, палітолаг, кіраўнік праекта "Наше мнение".

Раман ЯКАЎЛЕЎСКІ — аглядальнік міжнароднага інтэрнет-партала "Wider Europe";

Уладзімір МАЦКЕВІЧ — філосаф і палітолаг;

Юрый ЗІСЕР — старшыня дырэктараў партала tut.by;

Пётр МАРЦАЎ — стваральнік газеты БДГ, журналіст, бізнесмен і аналітык;

Максім ЖБАНКОЎ — кінакрытык, журналіст, выкладчык "Беларускага калегіума".

Як перамагчы і куды едзем?

У выніку эксперты вызначаюць 6 пераможцаў: па адным на кожную тэму. У дадатак па выніках галасавання вызначаюцца яшчэ 2, за працы якіх было аддадзена больш за ўсё галасоў. Гэтыя 8 асобаў паедуць у 4-дзённае падарожжа па Польшчы, дзе сустрэнуцца з палітыкамі, эканамістамі, даведаюцца болей пра польскія рэформы.

І памятайце — чым раней прышляце працу, тым большая колькасць чалавек паспее за яе прагаласаваць.

Кожны тыдзень у нядзелю на хвалях Еўрарадыё і на сайце www.belradio.fm наш новы праект "Беларусь tomorrow" — цыкл дыскусій пра будучыню Беларусі.

SOS!

Стаўрас ДЫМАС, Еўрапейскі камісар па экалогіі:

«Гістарычны абавязак нашага пакалення — не дапусціць катастрофы…»

У мінулы панядзелак прадстаўнікі амаль што ўсіх без выключэння краін свету сабраліся на інданезійскім востраве Балі на двухтыднёвыя перамовы па жыццёва важным пытанні, якое закранае ўсіх, — змяненне клімату. Еўрапейскі Саюз будзе выконваць ролю глабальнага лідэра, заахвочваючы больш рашучыя дзеянні.

Канферэнцыя ААН па змяненні клімату на Балі вельмі важная, бо імкліва бяжыць час, які мы маем на тое, каб не дазволіць глабальнаму пацяпленню дасягнуць небяспечных узроўняў, пры якіх у бліжэйшыя дзесяцігоддзі можа змяніцца аблічча планеты і парушыцца наша эканоміка.

Трывожная навуковая ацэнка, агучаная ў сярэдзіне лістапада Міжурадавай групай экспертаў ААН па змяненні клімату, сведчыць, што змяненне клімату "бясспрэчнае" і яно паскараецца. Усе сцэнарыі прагназуюць далейшае павышэнне тэмпературы ў бягучым стагоддзі, што можа прывесці нас у небяспечную зону, у якой надзвычайна павялічваецца рызыка незваротных і патэнцыйна катастрафічных змен у глабальнай экалагічнай сістэме.

Гэта гістарычны абавязак нашага пакалення — не дапусціць гэтага. Я лічу, што, уручыўшы сёлетнюю Прэмію міру Міжурадавай групе экспертаў і былому віцэ-прэзідэнту ЗША Элу Гору, Нобелеўскі камітэт ясна падтрымаў такое пасланне.

Аднак на сённяшні дзень мы знаходзімся ў сітуацыі, калі абавязкі індустрыялізаваных краін па змяншэнні выкідаў парніковых газаў заканчваюцца ў 2012 г. і ніяк не ўрэгуляваны пасля гэтага.

Міжнародная супольнасць павінна тэрмінова закрыць гэты прабел. Менавіта таму Еўрапейскі Саюз цвёрда пераканаваны, што Канферэнцыя на Балі павінна прыняць рашэнне аб пачатку перамоў аб усеагульным і амбіцыйным глабальным пагадненні аб клімаце на перыяд пасля 2012 г.

Мы павінны замацаваць апошні тэрмін для завяршэння гэтых перамоў — канец 2009 г., каб мець дастаткова часу для ратыфікацыі пагаднення і ўступлення яго ў сілу да 2012 г. Таксама мы павінны зацвердзіць "дарожную карту Балі" для перамоў па вызначэнні ўзроўню амбіцый, якія мы імкнемся прадэманстраваць, і па кампанентах будучага пагаднення.

Для ЕС бясспрэчным з'яўляецца пытанне аб тым, што мы павінны імкнуцца спыніць глабальнае пацяпленне на ўзроўні не большым за 2^0С у параўнанні з даіндустрыяльнай эпохай. Навукоўцы засцерагаюць нас, што гэта той узровень, пасля якога змяненне клімату будзе мець вельмі небяспечныя наступствы.

Дасягненне мэты ўтрымання ў межах гэтага ўзроўню азначае, што мы павінны дасягнуць абсалютнага максімуму выкідаў на працягу бліжэйшых 10—15 гадоў, а потым, да 2050 г., зменшыць іх на 50% у параўнанні з узроўнем 1990 г. Дасягненне падобнага змяншэння выкідаў — гэта без перабольшання гіганцкі выклік, але Міжурадавая група экспертаў падтрымлівае высновы Еўрапейскай камісіі, што тэхналагічна і эканамічна гэта магчыма, калі мы будзем дзейнічаць хутка. Пераход да глабальнай эканомікі з нізкім узроўнем вугляродных выкідаў таксама адчыняе вялізныя магчымасці для інавацыйнага развіцця, якое можа падштурхнуць эканамічны рост і стварэнне новых працоўных месц.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Народная Воля http://www.nv-online.info
6 СНЕЖНЯ 2007 г.

НАПЯРЭДАДНІ

9—10 снежня адбудзецца з'езд Партыі БНФ. Прапануем вам праграмныя артыкулы асноўных прэтэндэнтаў на пасаду старшыні партыі.

Віктар ІВАШКЕВІЧ

Нарадзіўся 21 верасня 1959 года ў Мінску. Завочна закончыў факультэт журналістыкі Белдзяржуніверсітэта імя Леніна (1991).

Працаваў галоўным рэдактарам газеты "Рабочий", віцэ-прэзідэнтам Беларускага кангрэса дэмакратычных прафсаюзаў (з 1997 г.).

На пачатку 1980-х актыўны ўдзельнік маладзёжных нефармальных накірункаў — "Майстроўня", "Талака", а дзін з найбольш таленавітых арганізатараў розных акцый і мерапрыемстваў.

З моманту ўтварэння камітэта па стварэнні БНФ у 1988 годзе — актывіст БНФ. Арганізатар масавых акцый і фінансавага забеспячэння работы Фронту. Адзін з галоўных арганізатараў хуткага колькаснага росту БНФ з-за масавага ўступлення ў арганізацыю жыхароў сельскіх рэгіёнаў Заходняй Беларусі зімой-восенню 1994—1995 гг.

Уваходзіў у групу лідэраў БНФ, якія выступалі з крытыкай Зянона Пазьняка падчас летняга 1996 года з'езда партыі. Восенню 1996 года пакінуў пасаду сакратара Управы БНФ, але захаваў членства ў гэтай палітычнай партыі.

Сёння Віктар Івашкевіч — намеснік старшыні Партыі БНФ, адказны сакратар Управы Партыі БНФ.

Арыштоўваўся, больш за дзесяць разоў падвяргаўся адміністрацыйным пакаранням (пачынаючы з 1988 г.).

Жанаты, мае сына.

Адкрыты ліст да сябраў Партыі БНФ

Паважаныя сябры!

Усім вам вядома, што я вылучыўся кандыдатам на пасаду старшыні Партыі БНФ. Для мяне гэта быў няпросты выбар, бо ён звязаны з ускладаннем на сябе новай працы, вялікай адказнасці і выбару новага лёсу. Шмат у каго гэты выбар выклікаў здзіўленне, і таму я хачу патлумачыць вам гэты мой, шмат для каго нечаканы крок.

Фронт у сённяшнім стане не здольны адстойваць незалежнасць Беларусі. І гэта ёсць галоўная прычына майго выбару.

Я ніколі не вызначаўся павышанымі амбіцыямі і з утварэння БНФ працаваў на тых накірунках, якія былі вельмі неабходнымі, але ніхто іншы не рашаўся за іх брацца. У 1989-1995 гадах я быў кіраўніком выбарчага штаба БНФ, сакратаром управы, кіраўніком дружыны і арганізатарам усіх масавых акцый. Прадстаўніком БНФ у Мінскім страйкаме.

У 1995—1997 гадах я ініцыяваў і ўзначаліў праграму "Народны універсітэт", праз навучанне ў якім прайшло шмат беларускіх актывістаў. У 1998—2002 — галоўным рэдактарам газеты "Рабочы". У 1999 годзе я падтрымаў кандыдатуру Вінцука Вячоркі на пасаду старшыні БНФ і стаў яго намеснікам, падтрымліваючы Фронт матэрыяльна і інфармацыйна (да 2002 года). У 2004 годзе пасля года зняволення на "хіміі" я вярнуўся ў Фронт, і ніхто на той час не згаджаўся брацца за арганізацыйна тэхнічныя справы на пасадзе сакратара Управы БНФ без матэрыяльнага забеспячэння. Я ўзяўся.

Бо без усёй гэтай працы немажліва паўнавартасная дзейнасць і барацьба Фронту за Незалежнасць. Можна толькі абстрактна дыскутаваць паміж сабой.

Акрамя арганізацыйнай працы і забеспячэння матэрыяльнага падмурку дзейнасці БНФ, пачынаючы з 2004 года я ўвесь час вяду дыскусію з Вячоркам ад тым, што больш важна — ініцыятыва ці асцярожнасць. Вінцук заўсёды казаў, што галоўнае — не нарабіць памылак. Я перакананы ў тым, што галоўнае — дзейнасць, падчас якой, натуральна, дапускаюцца памылкі і якая падпадае пад крытыку. Галоўнае — крытыку ўспрымаць і памылкі выпраўляць. Але ж менавіта старшыня БНФ ёсць рупар публічнай палітыкі, а кіраўнік выканаўчай структуры — толькі выканаўца. Таму ў грамадскай свядомасці БНФ усё больш і больш вызначаўся асцярожнасцю і невыразнасцю. Дайшло да таго, што летам 2006 года Фронт цалкам знік з медыйнай прасторы і грамадскай свядомасці, апынуўшыся ў цені барацьбы за лідэрства паміж беспартыйным А.Мілінкевічам і камуністам С.Калякіным. А на Кангрэсе АДС 2007 года БНФ ледзь назбіраў неабходную колькасць дэлегатаў, каб утварыць самастойную фракцыю і быць прадстаўленым у прэзідыуме АДС. Самая непрыемная сітуацыя пачалася тады, калі сябры БНФ пачалі шукаць сабе лідэра на баку. Аналізуючы гэтае становішча, я прыйшоў да высновы, што фронтаўцы пачалі разбягацца ў розныя "рухі" таму, што не бачылі ў кіраўніку БНФ таго, хто, высока ўзняўшы сцяг, павядзе іх да перамогі. Але, каб весці да перамогі, неабходна вылучыць такую праблему і такое патрабаванне, якія былі б падтрыманыя большасцю беларускага народа.

У 1989 годзе БНФ "Адраджэньне" здолеў сфармуляваць тое, што было падтрымана большасцю беларусаў: галоўныя праблемы — небяспека жыццю і здароўю ад чарнобыльскай радыяцыі і прагрэсуючае збядненне простых людзей. Галоўнае патрабаванне — скінуць уладу крамлёўскай і мінскай наменклатуры, якая дзеля захавання сваёй улады і сваіх прывілеяў штурхае народ у галечу і смерць. Менавіта таму, што кіраўніцтва БНФ убачыла тую антыкамуністычную хвалю, што падымалася ў грамадстве, і здолела яе ўзначаліць, стала магчымым праз 15 месяцаў пасля ўтварэння нешматлікай (14 чалавек) групы дэпутатаў — сябраў БНФ у Вярхоўным Савеце БССР абвясціць Незалежнасць Беларусі, ліквідаваць дыктатуру КПСС, зацвердзіць дзяржаўнымі сімваламі бел-чырвона-белы сцяг і герб Пагоня. На той час змаганне супраць камуністычнай сістэмы за Свабоду было змаганнем за Незалежнасць, якое стала пераможным.

Людзі па сёння ўдзячныя нам за перасяленне з забруджаных зон, за ратаванне ад смерці. Людзі добра памятаюць, што на аздараўленне ў краіны Еўрасаюза іх дзетак першымі вывезлі сябры БНФ. Таму "Чарнобыльскі Шлях" мусіць праходзіць пад сцягамі Еўрасаюза, і несці іх сёння могуць тыя дзеці, якія першымі паехалі ў Еўропу, а сёння ўжо нарадзілі і гадуюць сваіх!

На пачатку 1990-х гадоў адбыўся цуд, калі невялікай групе беларускіх нацыяналістаў удалося натхніць беларускае грамадства надзеяй на пабудову незалежнай Еўрапейскай Рэспублікі БЕЛАРУСЬ з адроджанай культурай. У грамадстве панавала аўра Адраджэння і імкненне да цывілізаваных еўрапейскіх норм жыцця. Людзі розных нацыянальнасцяў натхнёна вучылі родную мову і гісторыю, выхоўвалі ў дзяцях любоў да адроджанай Радзімы. І прычынай таго цуду стаў татальны давер насельніцтва да нас — фронтаўцаў, якія самаахвярнай барацьбой баранілі людзей, мацуючы той давер.

На жаль, на сёння рамантычная аўра Адраджэння і гэтыя надзея і вера ў патэнцыял БНФ у грамадстве страчаныя. І гэта, на мой погляд, наша самая вялікая страта і наша самая галоўная праблема, якая ставіць нас на мяжу трагічнай паразы ў барацьбе за Незалежнасць.

Сёння мы знаходзімся на пачатку крызісу сацыяльна-эканамічнай сістэмы лукашэнкаўскага рэжыму і ўзнікнення новых хваляў сацыяльнага пратэсту. У 2008 годзе мы абавязаныя ўзначаліць гэтыя пратэсты пад бел-чырвона-белым сцягам, бо інакш іх узначаляць крамлёўскія стаўленікі пад сцягам аб'яднання з Расіяй. Але, дзеля таго каб супрацьстаяць расійскай экспансіі і захаваць незалежнасць, мы мусім супрацьпаставіць ідэі аб'яднання з Расіяй іншую моцную і прывабную ідэю. Такой ідэяй не можа быць самаізаляцыя Беларусі ад усіх суседзяў. Такой ідэяй можа быць толькі інтэграцыя Беларусі з Еўрасаюзам. "Павысіць беларускія заробкі, пенсіі і стыпендыі да ўзроўню еўрапейскіх!", "Беларускаму народу — еўрапейскі дабрабыт!" — вось гэтыя і іншыя лозунгі могуць быць падтрыманы большасцю беларусаў на фоне пагаршэння жыццёвага ўзроўню. Доказам жа рэальнасці гэтых лозунгаў з'яўляюцца 12 прапаноў, зробленыя Еўрасаюзам беларускаму народу і беларускаму ўраду. Акрамя таго, трэба ўлічваць, што менавіта еўрапейскі сцяг абараніў гэтай восенню мінскіх маніфестантаў. І адмаўляцца ад гэтай абароны і дапамогі ў 2008-м, 2009 гадах было б велізарнай памылкай.

Так, наступны 2008 год будзе годам барацьбы за Незалежнасць, але зусім не таму, што на гэты год прыпадае юбілейная дата — 90 год БНР. А таму, што ў гэты год праз чарговае рэзкае павышэнне цэн на расійскія газ і нафту ўзмацніцца эканамічны ціск на Беларусь з мэтай паставіць пад кантроль расійскіх алігархаў ключавыя беларускія прадпрыемствы. Супрацьстаяць гэтай расійскай эканамічнай экспансіі мы павінны не столькі пры дапамозе семінараў па вывучэнні ўстаўных грамат БНР (што, несумненна, вельмі важна, хто б спрачаўся!), колькі праз масавую агітацыйную кампанію за пашырэнне эканамічнага супрацоўніцтва Беларусі з Еўрасаюзам і за еўрапейскі дабрабыт для беларускага народа.

Нам трэба давесці да людзей, што БНР утварылася як еўрапейская рэспубліка, бо была прызнаная еўрапейскімі краінамі. Што 90-годдзе БНР — гэта для Беларусі 90 год па-за межамі Еўрасаюза... на мяжы з ім, на крок да інтэграцыі з Еўрасаюзам, але па-за межамі еўрапейскай цывілізацыі.

Толькі калі мы даможамся перамогі еўрапейскай ідэі ў галовах большасці беларусаў, толькі тады мы здолеем паламаць усе спробы стварэння так званай саюзнай дзяржавы. Пра яе кіраўнікі Беларусі і Расіі цвердзяць як аб збыўшымся факце, а мы маўчым!

Такім чынам, АГІТАЦЫЙНАЯ КАМПАНІЯ "ЗА ЕЎРАПЕЙСКІ ВЫБАР" — ёсць ключавая кампанія наступнага года.

Другая важная кампанія — гэта КАМПАНІЯ ЗА СВАБОДНЫЯ ВЫБАРЫ, мэта якой — дамагчыся вызвалення палітвязняў, уключэння прадстаўнікоў БНФ і АДС у выбарчыя камісіі, рэгістрацыі кандыдатаў БНФ і АДС, празрыстага падліку галасоў. Дзеля гэтага Партыі БНФ і ўсім аб'яднаным дэмакратычным сілам трэба адназначна заявіць, што толькі пры ўмове выканання трох умоў мы возьмем удзел у выбарах. У іншым выпадку — адмова ад выбарчага фарсу і заклік людзей на вуліцу з патрабаваннем прыняцця 12 прапаноў Еўрасаюза. Бо толькі вызваленне палітвязняў здыме страх вылучэння ў выбарчыя камісіі, а наяўнасць там прадстаўнікоў АДС дасць сэнс удзелу кандыдатаў Партыі БНФ у выбарчай кампаніі, бо гарантуе праўдзівы падлік галасоў. Дамагчыся поспеху кампаніі "За свабодныя выбары" можна праз правядзенне масавых акцый у Беларусі і шырокай грамадзянскай кампаніі ў Еўропе з мэтай наўпроставага ўвязвання праграм еўрапейска-беларускага супрацоўніцтва з выкананнем умоў дэмакратызацыі. Пры гэтым задача масавых акцый у Беларусі — падштурхнуць і ўмацаваць кампанію салідарнасці ў Еўропе. Акцыя 25 сакавіка павінна стаць ключавой масавай акцыяй вясны 2008 года пад агульным лозунгам "За Незалежную Еўрапейскую Беларусь!". Што цалкам адпавядае праграме нашай партыі, у якой запісана, што адна з мэт — гэта ўваход Беларусі ў Еўрасаюз і НАТО.

Толькі на фоне першай кампаніі і пры ўмове выканання мэтаў другой кампаніі магчыма перамога ў ТРЭЦЯЙ КАМПАНІІ — ВЫБАРЧАЙ. Для гэтага неабходна сканцэнтраваць намаганні ў 20 выбарчых акругах, дзе аб'ектыўна моцныя праеўрапейскія настроі, і дзякуючы інтэнсіўнай агітацыйнай кампаніі пад лозунгам "Беларускаму народу — еўрапейскі дабрабыт" дамагчыся перамогі. Стварэнне фракцыі БНФ у Палаце прадстаўнікоў — гэта стварэнне плацдарма барацьбы за Свабоду і Незалежнасць Беларусі. Абапіраючыся на такі плацдарм, БНФ атрымае магчымасць рэалізаваць у 2009 годзе выкананне ўсіх умоў Еўрасаюза (свабода СМІ, свабода дзейнасці няўрадавых арганізацый, незалежны суд, свабода прафсаюзаў, свабода прадпрымальніцтва і г.д.), што дазволіць у 2010 годзе дамагчыся свабодных прэзідэнцкіх выбараў.

Калі ж нас не дапусцяць да выбараў, то мэтазгодна ў альтэрнатыву псеўдавыбарам праводзіць масавую кампанію ў падтрымку 12 прапаноў Еўрасаюза, наладзіць своеасаблівы грамадскі еўрарэферэндум. Утварыць еўраплацдарм у свядомасці людзей як альтэрнатыву дыктатуры, як маральна-псіхалагічны плацдарм для абароны Незалежнасці.

Рэалізацыя ўсіх трох кампаній — "За еўрапейскі выбар!", "За свабодныя выбары!", "За фракцыю ПБНФ" і дасягненне пастаўленых мэт — вызваленне палітвязняў выкананне 12 умоў Еўрасаюза і іншых — магчымы толькі тады, калі БНФ з маленькай партыі, адной з іншых маленькіх партый АДС, пераўтворыцца ў масавую партыю — лідэра шырокага народнага руху, які аб'яднае і беларускіх адраджэнцаў, і праеўрапейскіх прагрэсістаў, і прагматычных чыноўнікаў, і незадаволеных бізнесоўцаў, і пакрыўджаных "простых людзей". Дзеля гэтага кіраўніцтва Партыі БНФ мусіць рашуча ўзняць бел-чырвона-белы і еўрапейскі сцягі, заклікаць беларускае грамадства гуртавацца ў шырокі еўрапейскі рух і ўзяць на сябе адказнасць і цяжар працы па арганізацыі гэтага руху.

На жаль, сёння ні Вінцук Вячорка, ні Алесь Міхалевіч не здольныя дамагчыся лідэрства Фронту ў беларускім грамадстве, бо адзін прызвычаіўся хавацца ад персанальнай адказнасці за калегіяльнымі рашэннямі лідэраў АДС, а другі — за спінай Аляксандра Мілінкевіча. Абодвум больш даспадобы ціхія семінары, чым гучныя мітынгі. Абодва больш любяць закулісныя перамовы, чым публічныя дыспуты. Абодва больш занятыя барацьбой паміж сабой, чым выпрацоўкай планаў дзейнасці для ўсіх фронтаўцаў.

Таму я ініцыяваў "Еўрапейскі марш" і ўзначаліў яго аргкамітэт. Таму я выйшаў на Кастрычніцкую плошчу і высока ўзняў Беларускі і Еўрапейскі сцягі. Таму я вылучыўся на старшыню БНФ і разгарнуў у СМІ дыскусію аб лёсе Народнага Фронту. Таму, сябры, я пішу вам гэты ліст. Пішу адкрыта, як усё, што рабіў раней, бо хачу, каб наша партыя была сапраўды НАРОДНАЙ і аб'яднала ўсіх думаючых людзей, усіх, каму дорагі ідэалы Незалежнасці Радзімы.

Дзякуючы "Еўрамаршу" і дыскусіі ў СМІ Партыя БНФ ужо тры месяцы з'яўляецца інфармацыйным лідэрам, а цікавасць да нашага з'езда ў дэмакратычным грамадстве неверагодна вялікая. Нават тыя газеты, якія гадамі ні радка не друкавалі пра нашу дзейнасць, зараз аддаюць нам цэлыя палосы! І самае галоўнае, што ідэі Незалежнасці Беларусі, Еўрапейскага выбару, Свабоды і дэмакратыі ў гэты час моцна гучаць у грамадстве, можна сказаць, дамінуюць.

А ў гэты час асобныя фронтаўцы пагрозліва запалохваюць, што публічнасць і галоснасць перадвыбарчай барацьбы наладжаны спецслужбамі!

Паўтару! Гэта я арганізаваў галоснасць у абмеркаванні кандыдатаў на пасаду старшыні і буду змагацца за тое, каб БНФ не быў маленечкай кішэннай партыяй.

Зараз усе з прыхаванай надзеяй чакаюць рашэнняў з'езда. Чакаюць цуду прарыву згуртаваных фронтаўскіх аддзелаў з ціхага апазіцыйнага балотца на шырокую грамадскую прастору. Спадзяюцца насуперак свайму асцярожнаму песімізму, што змены магчымыя.

І няма чаго запалохваць сябе расколам. Я гарантую, што стварэнне магчымасць Вінцуку Вячорку на семінарах для нашых фронтаўцаў чытаць лекцыі па ідэалогіі кансерватызму, а на замежных канферэнцыях выступаць з дакладамі аб еўрапейскім выбары Беларусі. Я дапамагу Алесю Міхалевічу стаць публічным палітыкам праз узначаленне любой з пералічаных мной кампаній.

Пры абранні старшыні вам давядзецца ўважліва выбіраць паміж праграмамі і арганізацыйнымі здольнасцямі іх выконваць. Выбар — заўжды цяжкая справа. Але ад яго залежыць дасягненне перамогі.

Нам трэба ведаць, што, толькі ставячы перад сабою вялікія задачы, магчыма дасягнуць вялікай мэты. Нам трэба паверыць, што менавіта на нас ляжыць вялікая місія прывесці Беларусь да Свабоды! Нам трэба адчуць локаць адзін аднаго і непераможную моц нашага фронту! І тады, разам, мы пераможам! Жыве Беларусь!

Ваш сябар па барацьбе — Віктар ІВАШКЕВІЧ.

(Праграмныя артыкулы прэтэндэнтаў на пасаду старшыні Партыі БНФ В.Вячоркі і А.Міхалевіча чытайце ў наступным нумары.)

Как Хоружик отбил «наезд» ...

Председатель Комитета госконтроля Зенон Ломать на заседании президиума Совета Министров заявил, что в стране действует программа по оздоровлению озера Нарочь, однако средства на эти цели не осваиваются. На его взгляд, Минприроды нерезультативно взаимодействует с белорусскими учеными в поиске решений этой проблемы.

По словам председателя президиума Национальной академии наук Михаила Мясниковича, ученые предоставили министерству целый ряд предложений по улучшению экологической ситуации на озере, однако эти предложения не были поддержаны.

В то же время министр природных ресурсов и охраны окружающей среды Леонтий Хоружик подчеркнул, что в мире пока не найден эффективный способ борьбы с отдельными видами вредных насекомых, загрязняющих озера. Поэтому все проводимые мероприятия по оздоровлению озера Нарочь пока не дают существенных результатов.

Проекты документов по проблемам экологии отправлены на доработку, сообщается на сайте Совмина.

Пляски на костях?

Я была буквально ошарашена, когда 7 ноября включила телевизор и увидела концерт "Назад, в СССР".

Не пойму, как можно в этот день петь и веселиться, как можно считать его праздничным? Ведь в этот день две печальные даты: октябрьский переворот (1917 г.), положивший начало массовому уничтожению собственного народа, и погром (в 1941 г.) Минского гетто, когда были уничтожены сотни людей.

Что это — пляска на костях усопших?

Лучше пастора Павла Аносова мне не сказать. Говоря о подобном, он привел слова одного пророка из Ветхого Завета: "Горе тем, которые зло называют добром..."

Розалия РУБИНЧИК, жительница г.Минска.

ИЗ ПЕРВЫХ УСТ

Это интервью мы еще на прошлой неделе разместили на своем интернет-сайте — nv-online.info. Дело в том, что В.Коноплев ответил на вопросы тогда, когда макеты очередного номера "Народной воли" уже лежали в смоленской типографии.

Поскольку интерес к отставке Коноплева, особенно причинам, ее породившим, у общественности не исчез, мы решили дать полный текст этого интервью в текущем номере.

Владимир КОНОПЛЕВ:

«Немножко рога отрезали, а так все хорошо...»

28 ноября экс-председатель Палаты представителей Владимир Коноплев впервые после своей отставки появился в Овальном зале на пленарном заседании. Любопытно, что некоторые депутаты поначалу даже не замечали Владимира Николаевича, хотя он сидел почти в самом центре зала. Возможно, всему виной — новый имидж Коноплева. Он почти избавился от своей бороды, и теперь носит модную короткую стрижку.

В этот день депутаты задавали вопросы правительству. У Коноплева к министрам вопросов не было.

После пленарного заседания Владимир Коноплев любезно ответил на несколько вопросов "Народной воли".

— Расскажите, как ваше здоровье?

— Ну, видишь, какой я теперь, — улыбнувшись, сказал Владимир Николаевичв, демонстрируя то ли два слегка выступающих шва над бровями, то ли новую прическу.

— Ну, можно сказать, что помолодели...

— Немножко рога отрезали, а так все хорошо, — попытался отшутиться Коноплев.

— Ну и как вам работается в качестве простого депутата?

— Нормально...

— Тут столько слухов ходило по поводу вашей отставки. Говорили, будто вы взятку в полмиллиона долларов взяли, и что в отношении вас якобы едва не возбудили уголовное дело...

— Я не только слышал об этих слухах, но и читал, что писали обо мне на некоторых сайтах. Рад, что обо мне сразу дали столько информации... Я догадываюсь, кто и чей заказ выполнял... А вообще, благодарен оппозиционной прессе и журналистам, что они не писали про меня никаких гадостей.

— У вас уже период реабилитации закончился?

— Да, уже все нормально. Мне в Санкт-Петербурге сделали операцию.

— А кто делал и почему именно там?

— Дело в том, что у нас пазухи нигде не вскрывают. А мне на одной пазухе сделали шесть операций. Оперировал меня известный петербургский хирург-оториноларинголог профессор Ситников. Он долгое время работал в Беларуси, а сейчас трудится в Военно-медицинской академии в Санкт-Петербурге.

— А ваша супруга почему уволилась из Министерства образования? Чтобы быть рядом с Вами?

— Ну... Можно сказать и так...

— После вашей отставки некоторые аналитики заговорили о том, что якобы Вы намерены выставить свою кандидатуру на следующие президентские выборы...

— Это только мои недруги могут так сказать. Человек, который столько лет был вместе с президентом, и дальше будет вместе с ним.

— До конца?

— Конечно, ну о чем говорить...

— Расскажите, за что задерживали вашего водителя?

— А я впервые слышу, что моего водителя задерживали...

Марина КОКТЫШ.

ИЗ АРХИВА

О том, что Владимир Коноплев написал заявление об уходе с должности по состоянию здоровья, стало известно за несколько дней до начала осенней сессии Палаты представителей.

После отставки ни сам Коноплев, ни его близкие не общались с журналистами.

ЧУЛІ?

Прэзідэнт Літвы стаў «Еўрапейцам года»

На мінулым тыдні сталі вядомыя імёны лаўрэатаў прэміі "Еўрапеец года-2007", якую прысуджае штотыднёвік "European Voice".

Штогод штотыднёвік намінуе 50 еўрапейцаў за заслугі перад Еўрапейскім Саюзам у дзевяці катэгорыях. Самая прэстыжная — "Еўрапеец года", у якой сёлета і перамог літоўскі лідэр **Валдас Адамкус**. Ён стаў абсалютным пераможцам і першым прадстаўніком новай краіны — члена ЕС, які атрымаў прэстыжны тытул.

Сярод намінантаў ёсць і прадстаўнікі краін, якія не ўваходзяць у Еўрапейскі Саюз. Тытул "Нееўрапеец года" атрымаў лідэр расійскага Аб'яднанага грамадзянскага фронту **Гары Каспараў** за "барацьбу за палітычныя свабоды". Галівудскі акцёр і губернатар штата Каліфорнія **Арнольд Шварцэнегер** быў узнагароджаны за кампанію супраць забруджвання навакольнага асяроддзя.

На цырымоніі ўручэння ўзнагарод, якая адбылася ў брусельскім Палацы Эгманта, Валдас Адамкус адзначыў:

— Я перакананы, што маладая і малая краіна Еўрапейскага Саюза можа зрабіць вельмі многа. Прыемна, што як прадстаўнік і кіраўнік Літвы я змог садзейнічаць рашэнню адной з галоўных праблем ЕС, звязаных з Канстытуцыяй і будучым. Для нас, перагаворшчыкаў, чэрвеньская ноч дыскусій у Бруселі была лепшым урокам таго, што нават па самых складаных пытаннях Еўрапейскі Саюз можа прыйсці да адзінага рашэння. Я выказваю падзяку кіраўнікам Польшчы, якія ўсвядомілі важкасць гістарычнага моманту, і маім калегам па перамовам — канцлеру Германіі Ангеле Меркель і кіраўніку Францыі Нікаля Сарказі, разам з якімі мы змаглі знайсці прымальнае для Еўрапейскага Саюза пагадненне.

Таксама я хачу выказаць падзяку жыхарам краін Еўрапейскага Саюза і сваім суайчыннікам, падтрымаўшым маю кандыдатуру і мае намаганні.

ТЫМ ЧАСАМ

Хто такі Аляксандр Лагвінец?

Амаль у той самы час, як у Бруселі вызначалі пераможцаў прэміі "Еўрапеец года", нямецкі фонд імя Гайнца Шварцкопфа "Маладая Еўропа" ўганараваў "Прэміяй Еўропы" беларуса Аляксандра Лагвінца. У сераду ў Берліне адбылося ўрачыстае ўзнагароджанне наміманта.

Гэтая прэмія прысуджаецца арганізацыі альбо прыватнай асобе, якая адмысловым чынам паспрыяла еўрапейскай згодзе і інтэграцыі Еўропы. Імя маладога палітолага Аляксандра Лагвінца не на слыху ў Беларусі. Таму мы і вырашылі даведацца, хто ён такі. Які зрабіў унёсак у наладжванне лепшага паразумення паміж Беларуссю і Еўрапейскім Саюзам?

Высветлілася, што Аляксандр Лагвінец — выкладчык паліталогіі ў Еўрапейскім гуманітарным універсітэце і памочнік лідэра дэмакратычнага руху "За свабоду" Аляксандра Мілінкевіча. Двойчы ў 2004-м і ў 2007 годах малады палітык балатаваўся ў беларускі парламент па Сухараўскай акрузе Мінска, актыўна ўдзельнічаў у прэзідэнцкай кампаніі 2006 года ў камандзе Аляксандра Мілінкевіча.

— Казаць пра сябе нясціпла, — мы датэлефанаваліся да Аляксандра Лагвінца амаль за 15 хвілін да ягонага адлёту ў Германію. — Я магу патлумачыць, чым займаюся. Цягам некалькі год я выкладаю ў ЕГУ прадметы, якія звязаны з еўрапейскай інтэграцыяй. Апроч іншага пішу артыкулы пра стасункі Беларусі з Еўрасаюзам, і гэтыя артыкулы друкаваліся не толькі на беларускіх інтэрнэт-рэсурсах, але і за мяжой.

Кандыдатуру беларуса Аляксандра Лагвінца на "Прэмію Еўропы" намінаваў уладальнік прэстыжнай узнагароды 1997 года чэх Давід Штулік. Свой выбар ён патлумачыў так: "Працяглы час еўрапейская супольнасць не звяртала ўвагі на Беларусь з прычыны палітычных цяжкасцяў у двухбаковых дачыненнях. Сітуацыя зараз мяняецца, дзякуючы беларусам з еўрапейскімі поглядамі, якія не перастаюць паўтараць, што Беларусь з'яўляецца часткай Еўропы. Іх праца знаходзіць водгукі і прызнанне ў Еўропе".

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

SOS!

«Гістарычны абавязак нашага пакалення — не дапусціць катастрофы...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Адным з ключавых кампанентаў будучага пагаднення па клімаце павінна быць сур'ёзнае і абавязковае змяншэнне выкідаў развітымі краінамі. Еўрапейскі Саюз прапануе развітым краінам узяць на сябе абавязак зменшыць іх агульныя выкіды на 30% у параўнанні з 1990 г. да 2020 г., і на 60—80% да 2050 г.

Еўропа гатова ўзяць такі абавязак пры ўмове, што астатнія развітыя краіны падчас будучых перамоў пагодзяцца зрабіць параўнальныя высілкі. Між тым Еўрапейскі Саюз ужо ўзяў на сябе абавязак, незалежна ад таго, што будуць рабіць іншыя, зменшыць свае выкіды як мінімум на 20% ад узроўняў 1990 г. да 2020 г.

Відавочна, што развітыя краіны павінны быць лідэрамі на шляху скарачэння выкідаў. Але калі мы хочам спыніць глабальнае дацяпленне на ўзроўні ніжэй за 2°С, вельмі важна, каб іншыя краіны — асабліва новыя індустрыяльныя дзяржавы — таксама зрабілі ўнёсак у глабальныя высілкі. Мы павінны знайсці шляхі, каб дапамагчы ім абмежаваць інтэнсіўнасць выкідаў ад іх эканамічнага росту пры дапамозе разнастайных падыходаў, у тым ліку праз меры па заахвочванні і тэхналагічнае супрацоўніцтва.

Канферэнцыя на Балі — важны тэст палітычнай волі міжнароднай супольнасці да ператварэння нашых новых навуковых ведаў, агучаных Міжурадавай групай экспертаў, у дзеянні. Я рады канстатаваць, што мы бачым некаторыя пазітыўныя знакі.

Значны палітычны імпульс быў дадзены сёлета на такіх мерапрыемствах, як Сустрэча Вялікай васьмёркі і Сустрэча на вышэйшым узроўні па пытаннях змянення клімату пад старшынствам Пан Гі Муна ў верасні. Злучаныя Штаты заявілі, што яны больш не супраць пачатку перамоў. Новы прэм'ер-міністр Аўстраліі заявіў, што яго ўрад зробіць барацьбу са змяненнем клімату прыярытэтам і ратыфікуе Кіёцкі пратакол. Я вельмі вітаю гэты новы канструктыўны падыход.

Я маю асцярожны аптымізм, што хутка мы зможам пачаць перамовы па новым глабальным пагадненні аб клімаце. Менавіта тады пачнецца сапраўдная праца. У нас наперадзе — два вельмі напружаныя гады. Еўрапейскі Саюз будзе рабіць усё, што ад яго залежыць, каб глабальныя дзеянні пасля 2012 г. былі дастатковымі для таго, каб узяць змяненне клімату пад кантроль, пакуль яшчэ не позна.

Народная Воля http://www.nv-online.info
6 СНЕЖНЯ 2007 г.

ПРИГОВОР

Людмила ХОЛОД, жена бывшего чиновника Администрации президента:

«Хотелось только посмотреть друг на друга и все...»

На минувшей неделе Верховный суд Беларуси вынес приговор по уголовному делу в отношении бывшего первого заместителя начальника Главного идеологического управления Администрации президента Владимира Холода.

Совершенно секретно

Напомним, что судебные слушания по данному делу проходили в закрытом судебном заседании. Почему — неизвестно.

Дело Холода рассматривала судья **Ирина Тылец**. Однако 30 ноября в зале суда №1 информацию о вынесенном приговоре зачитывала журналистам пресс-секретарь Верховного суда **Анастасия Циманович** — несмотря на повышенный интерес общественности к данному делу, дату и время оглашения приговора в Верховном суде по каким-то непонятным причинам скрыли.

Собравшимся журналистам **Анастасия Циманович** зачитала буквально следующее: *"Приговором от 29 ноября 2007 года, вынесенным коллегией по уголовным делам Верховного суда Республики Беларусь, Холод Владимир Федорович признан виновным в завладении имуществом путем обмана и злоупотреблением доверия, совершенном повторно, в особо крупном размере, а также в подстрекательстве к даче взятки, совершенном повторно, в крупном размере. По совокупности преступлений Холоду Владимиру Федоровичу назначено наказание в виде лишения свободы сроком на восемь лет с конфискацией всего имущества, лишением права занимать в учреждениях, организациях и на предприятиях должности, связанные с исполнением организационно-распорядительных обязанностей сроком на пять лет, а также лишение воинского звания. Отбывание основного наказания назначено в исправительной колонии в условиях усиленного режима".*

Кстати, в понедельник, 3 декабря, на сайте Верховного суда Беларуси данная информация отсутствовала. Стоит отметить, что, на сайте Верховного суда практически вся новостная информация *"вчерашняя"* — нет анонсов, что, например, сегодня будет вынесено решение по такому-то делу, нет списка рассматриваемых дел и фамилий судей, их рассматривающих. Нерегулярно информация о рассматриваемых делах обновляется и на информационном стенде в здании Верховного суда. Будто специально для того, чтобы не привлекать внимание журналистов к особо громким процессам.

Наперекор Лукашенко?

Напомним, что во время одной из пресс-конференций А.Лукашенко "спрогнозировал", что Владимиру Холоду дадут примерно 13 лет.

"Кому-то наобещал, его там прихватили, попросили у меня разрешения на оперативную разработку, — сказал Лукашенко. — *Пожалуйста — разработали. Под контролем две взятки дал. Посадили — вот пусть теперь отмазывается. А это лет, наверное, 13... Лет 13 получит..."*

Получается, судья **Ирина Тылец** продемонстрировала неслыханную смелость и независимость, назначив Холоду более мягкое наказание?

Или кто-то не совсем верно проинформировал главу государства о том, на сколько лет могут посадить арестованного чиновника?

Впрочем, достоверно не известно, именно ли о Холоде говорил Лукашенко. Но о других подобных "громких" задержаниях ничего не известно.

Замечательный сосед

Семья Владимира Холода живет в многоэтажном кооперативном доме на третьем этаже. Некоторых соседей Холода пригласили в качестве понятых, когда представители правоохранительных органов нагрянули к ним в квартиру.

Соседи рассказывают, что накануне ареста Холод будто бы пришел с работы слегка навеселе. Утром уехал на работу и... домой больше не вернулся. А супруга бывшего чиновника Администрации президента, увидев на пороге своей квартиры представителей правоохранительных органов и услышав, зачем они пришли, почти лишилась чувств.

Люди, живущие с Холодом в одном подъезде, естественно, в общих чертах знают, за что посадили их соседа.

В этом подъезде на третьем этаже жил Владимир Холод.

"Говорят, он решал экономические вопросы, несмотря на то, что занимался идеологией, — делились они с "Народной волей". — *И что якобы многие шли со своими проблемами именно к нему. За решение вопросов он вроде бы брал деньги, но какие-то вопросы решить не мог. Не исключено, что люди, заплатившие ему за решение своей проблемы, его и сдали..."*

Соседи заметили, что Холод сменил несколько машин. Вначале ездил на "Форд-скорпио", затем — на "Фольксваген Passat B5", а в последнее время пересел на "лупатый" "Мерседес".

Владимир Холод жил вместе с женой и сыном. У него еще есть старшая дочь, она замужем и живет отдельно от родителей.

ПРЯМАЯ РЕЧЬ

«Меня туда никто не приглашал...»

"Народная воля" решила поинтересоваться у жены Владимира Холода, как он воспринял приговор. Может, выслушав судью, успел что-то сказать из клетки, в которой обычно в зале суда содержат обвиняемых?

— А что я вам могу сказать, я что, там была? — со слезами ответила Людмила Аркадьевна.

— А вас разве не позвали на приговор?

— Но если суд закрытый... Меня никто никуда не приглашал.

— А может, кто-то из родственников был?

— Никого не было.

— Это так странно, ведь на оглашении резолютивной части приговора, даже если дело слушается в закрытом режиме, законом не запрещено присутствовать...

— Мне от этого не легче...

— А вам свидание с мужем хотя бы давали?

— Да, давали.

— И что он говорил?

— Ничего... Мы ни о чем не говорили... Хотелось только посмотреть друг на друга и все. О чем можно говорить? Приговор вынесен, все решено.

— А вы знаете, в какой колонии он будет отбывать наказание?

— Нет. Я вообще ничего не знаю. И ничего не хочу. Хочу только одного — чтобы все оставили меня в покое... Мне уже все равно никто не поможет... Простите меня, до свидания...

КОМПЕТЕНТНОЕ МНЕНИЕ

Андрей БАСТУНЕЦ, заместитель председателя Белорусской ассоциации журналистов, юрист:

*В Беларуси планируется реализовать совместный международный проект по изучению синдрома хронической усталости. Об этом сообщил директор Республиканского научно-исследовательского института эпидемиологии и микробиологии профессор **Леонид ТИТОВ** в ходе научно-практической конференции "Вирусные инфекции: эпидемиология, клиника, лабораторная диагностика и профилактика".*

В проекте помимо названного белорусского НИИ примут участие медицинские научно-исследовательские учреждения Латвии и Англии. По словам Л.Титова, в рамках проекта в этих странах будут отбираться пациенты с симптомами синдрома хронической усталости и изучаться причины их заболевания. Проект направлен на улучшение диагностики и лечения таких пациентов, поскольку данная проблема актуальна для Беларуси и других стран.

Известно, что синдром хронической усталости может быть связан с вирусом герпеса, гормональным статусом человека, состоянием центральной нервной системы человека. Однако, как бороться с заболеванием, точно не знает никто.

Синдром хронической усталости называют еще усталостью, которая не проходит даже после необходимого всем отдыха. От такого состояния врачи советуют не отмахиваться, поскольку оно достаточно серьезно и может длиться месяцами, а иногда и годами.

Медики считают, что, хотя заболеть этой болезнью может каждый, классический вариант — это женщина в возрасте от 20 до 50 лет, часто многого добившаяся, образованная.

Большинство больных говорят, что они начали чувствовать усталость сразу же после того, как переболели инфекционным заболеванием, например гриппом. Они даже могли назвать точную дату начала заболевания.

При диагностике синдрома хронической усталости должны быть исключены любые психические заболевания, такие как депрессия, которая имеет похожие симптомы, различные инфекционные заболевания, гормональные нарушения, например, связанные с нарушением функции щитовидной железы, злоупотребление лекарствами, воздействие токсических веществ.

Пока одни медики изучают синдром, другие советуют, как самому попробовать смягчить его влияние на жизнь.

— Правильно питайтесь. Синдром хронической усталости не связывают с недостатком витаминов или минеральных веществ, но пища, содержащая нужное количество питательных веществ, включая необходимое число калорий, влияет на самочувствие страдающих синдромом хронической усталости. Некоторые сообщают, что они чувствуют себя лучше, если употребляют меньше сахара и жиров.

— Каждый день выполняйте физические упражнения. Даже небольшая физическая нагрузка, например, простые упражнения на растяжение, помогут вам. Постоянное перенапряжение обычно ухудшает течение болезни, затягивает ее. Большинство специалистов не считают, что длительное пребывание в постели может ускорить наступление улучшения.

— Из всех дел выбирайте самые важные. Отказывайтесь от дел, которые представляются вам наименее важными, строго придерживайтесь этого правила.

— Щадите членов вашей семьи и друзей. Если вы будете без конца рассказывать о вашей болезни близким родственникам, это может вызвать обратную реакцию.

— Продолжайте жить. Сохраняйте оптимизм. Те, кто не опускает руки, лучше всего справляются с болезнью.



Елена СПАСЮК.

ВОПРОС-ОТВЕТ

«Мокрое» дело

Сын страдает повышенным потоотделением. Из-за этой, казалось бы, небольшой проблемы у него развивается комплекс, он стал нервным, мало общается со сверстниками. Как можно бороться с таким явлением, как чрезмерное потоотделение?

Галина Викторовна, Минская обл.

Потоотделение является одним из основных принципов терморегуляции нашего организма: испаряясь с поверхности кожи, влага охлаждает тело. Регулируется деятельность потовых желез вегетативной нервной системой — в ответ на повышение температуры нервные клетки дают импульс железам, и те, сокращаясь, выделяют пот.

Первым средством борьбы с потом являются дезодоранты-антиперспиранты. В их состав входят вещества, подавляющие потоотделение (соли алюминия, свинца, цинка, железа, формальдегид, этанол). Также в состав многих антиперспирантов входят вещества, которые подавляют размножение бактерий, что помогает устранить неприятный запах.

Хороший антиперспирант практически полностью устраняет внешние проявления гипергидроза — повышенного потоотделения, к тому же прост в использовании. Правда, эффект от дезодоранта может быть довольно кратковременным, а вещества, входящие в его состав, иногда вызывают аллергию.

При неэффективности антиперспирантов можно прибегнуть к инъекции ослабленного токсина возбудителя ботулизма — ботокса. Этот препарат парализует мелкие нервные окончания и блокирует работу потовых желез. Зону повышенного потоотделения обкалывают ботоксом, что позволяет добиться достаточно длительного (до 5—7 месяцев) эффекта. Правда, по истечении этого срока процедуру придется повторить.

Случается, что проблему пациента, которому поставлен диагноз "гипергидроз", можно решить только хирургическим путем. Методы хирургического лечения можно разделить на две группы. Первая — воздействие непосредственно на место повышенного потоотделения. Самым простым способом является удаление участков кожи, содержащих избыточное количество потовых желез. Более щадящим воздействием на кожу является кюретаж — метод, сходный с липосакцией. Через небольшой прокол под местным обезболиванием проводится удаление потовых желез и пересечение веточек симпатического нерва на уровне подкожной клетчатки. Этот метод считается достаточно эффективным — потливость снижается на 90%, а также устраняется специфический запах. Операция легко переносится и не требует длительного нахождения в стационаре.

Алеся КОВАЧ.

У Лейпцыгу ратуюць беларускага Ваню

Шпіталь Санкт-Георг (Лейпцыг, Германія) збірае ахвяраванні на аперацыі для беларускага хлопчыка Вані Шубарава.

У лютым, падчас пажару ў кватэры ў Гомелі, 7-гадовы Ваня атрымаў 50 працэнтаў апёкаў скуры, яго сястра загінула. У шпіталь у Лейпцыгу хлопчыка даставілі 26 лістапада. Дзіцяці, у якога згарэў твар, патрэбна не менш за 10 складаных аперацый.

Клініка заклікае рабіць ахвяраванні на банкаўскі рахунак:

Spendenkontonummer 11; Bankleitzahl 860 205 00; Kreditinstitut Bank fur Sozialwirtschaft AG Leipzig

з заўвагай: *Hilfe fur schwer brandverletztes Kind.*

Нямецкая прэса паведамляе, што ўрачы змагаюцца за кожны міліметр скуры Вані. Першымі аперацыямі спрабавалі выратаваць левую руку і правае вока беларускага хлопчыка. Сродкі на іх ахвяравала таксама грамадская арганізацыя "Ein Herz fur Kinder".

Марына РАХЛЕЙ.

Чаму «хуткая» не заўсёды можа дапамагчы?

У замене маюць патрэбу 34% санітарнага транспарту службы хуткай медыцынскай дапамогі. Пра гэта падчас рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі "Актуальныя пытанні арганізацыі хуткай медыцынскай дапамогі на сучасным этапе" ў Мінску паведаміў галоўны ўрач Мінскай гарадской клінічнай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі Віктар Сірэнка.

Паводле яго слоў, гэта звязана з завяршэннем тэрміну эксплуатацыі транспарту, яго маральнай і фізічнай зношанасцю. Спецыяліст паведаміў, што за дзевяць месяцаў гэтага года службай набыта 127 санітарных аўтамабіляў, і цяпер іх колькасць складае 1263 машыны. Пры гэтым В.Сірэнка зазначыў, што ў Беларусі працуюць толькі восем рэанімабіляў, з якіх чатыры — у сталіцы.

Гаворачы аб праблемах матэрыяльна-тэхнічнага аснашчэння спецыялізаванага транспарту, В.Сірэнка паведаміў, што на ўсе машыны хуткай медыцынскай дапамогі прыходзіцца толькі 960 электракардыёграфаў. Паводле яго слоў, толькі 33% машын аснашчаны дэфібрылятарамі — апаратамі, неабходнымі для эфектыўнай рэанімацыі.

Таксама спецыяліст узняў праблему адсутнасці ў службы эфектыўнай радыёсувязі для кантакту са службай ратавання і міліцыяй. На яго думку, выдзяленне радыёчастаты дазволіла б службе хуткай медыцынскай дапамогі больш аператыўна рэагаваць у крызісных сітуацыях.

Таццяна ДАРАШЧОНАК.

ФИЗКУЛЬТ-УРА!

Как правильно бегать

Представьте такую картину: вы стоите на автобусной остановке, на улице минусовая температура. И вдруг мимо вас пробегает подтянутый мужчина лет 50 в одних шортах...

Бегать, конечно, умеют все. А вот бегать с пользой для здоровья — далеко не каждый.

Какая польза от бега?

Бег является одним из самых доступных и эффективных способов тренировки организма. О пользе бега написан не один научный труд. Сказать что-то новое проблематично. Известно, что при регулярных занятиях оздоровительным бегом улучшается настроение, повышается работоспособность, исчезают головные боли. При беге легкие человека работают значительно активнее, тем самым лучше обеспечивая снабжение клеток организма кислородом. Благодаря ускорению обменных процессов улучшается общее самочувствие. Кроме того, значительные затраты энергии во время тренировок способствуют избавлению от лишнего веса. Бег укрепляет мышечную систему человека, увеличивает подвижность в суставах, более прочными становятся связки, улучшается координация движений. Во время бега задействуются практически все мышцы нашего организма. После пробежек выделяется гормон счастья, что позволяет успешно бороться с депрессией. Бег способствует закаливанию.

Однако есть и обратная сторона медали. В связи с усиленной работой легких во время бега им не могут заниматься люди, страдающие различными заболеваниями легких, а также имеющие проблемы, связанные с работой сердечной мышцы, перенесшие некоторые операции, страдающие варикозным расширением вен, болезнями суставов, плоскостопием.

Как заниматься бегом

Главным правилом является постепенное увеличение нагрузки. Не стоит перенапрягаться. Начать можно с пеших прогулок, постепенно увеличивая скорость ходьбы. Затем можно перейти на небольшие пробежки, чередуя их с ходьбой. И только потом, когда организм привыкнет к нагрузкам, можно использовать бег в чистом виде. Ведь нетренированному человеку вредны большие физические нагрузки.

Занятия бегом должны занимать не менее получаса в день. Если после пробежки самочувствие ухудшается, стоит уменьшить нагрузку или прекратить заниматься вовсе. При беге нужно соблюдать правильную позу. Не следует сильно наклоняться вперед, опускать голову вниз или запрокидывать назад, высоко поднимать подбородок. Еще при беге нужно полностью расслабить мышцы рук, плечевого пояса. Со временем у вас выработается собственная, наиболее рациональная и экономичная техника бега.

Важно помнить о правильном дыхании. Тем, кто занимается оздоровительным бегом, нужно дышать только через нос, в таком случае вдыхаемый в легкие воздух предварительно очищается, согревается.

Особенно важно внимательно относиться к беговым тренировкам людям с лишним весом — ведь их ноги и так постоянно испытывают дополнительную нагрузку. Перед тем как побежать, нужно выполнить разминку, для того чтобы разогреть организм и разогнать кровь. Для этого достаточно пройтись в быстром темпе, так, чтобы участился пульс. Сделать несколько глубоких вдохов носом с полным выдохом через рот. Выполнить маховые движения руками и ногами, вращательные движения туловищем. Полезно потянуть разогретые мышцы, особенно мышцы ног и спины.

МАСТЕР-КЛАСС

Ольга БАРАБАНЩИКОВА, певица и спортсменка:

«Бег полезен для тех, кто борется с целлюлитом...»

— Лично я положительно отношусь к бегу, так как сама просто не представляю свою жизнь без постоянных тренировок. На мой взгляд, бег особенно полезен для тех, кто борется с целлюлитом. Самое главное — правильно подобрать дистанцию и темп. Старайтесь всегда бежать с одной скоростью. На старте умерьте свой пыл, а на финише, наоборот, поднапрягитесь. Бег не должен изматывать. Но некоторое напряжение в мышцах вы должны чувствовать. Хорошая спортивная обувь с мягкой подошвой предохранит суставы от ударных нагрузок. Рекомендую бегать по твердому покрытию. Правда, перед тем как побежать, на всякий случай проконсультируйтесь с врачом...

МНЕНИЕ СПЕЦИАЛИСТА

Наталья МАСЛОВА, врач-реабилитолог медицинского центра «Экомедсервис»:

— Стоит отметить, что занятия бегом подходят не всем. В последнее время оздоровительный бег отошел на второй план, он уже не так популярен, как раньше. Это произошло в связи с тем, что появилось много других возможностей поддерживать здоровый образ жизни: например, бассейн или те же танцы.

Оздоровительным бегом может заниматься только абсолютно здоровый человек. А в наше время проблематично встретить людей с отменным здоровьем. Например, совсем недавно в Америке была мода на оздоровительный бег. Тысячи американцев выходили на пробежки. Что получилось в результате? У многих возникли проблемы с суставами. Поэтому прежде, чем бежать, пройдите обследование, проконсультируйтесь со специалистом, а потом уже принимайте решения.

Мне довольно часто приходится наблюдать, как кто-то совершает пробежку. Главная ошибка, которую допускают бегуны, — это неправильный выбор обуви. Для пробежек требуется специальная и качественная обувь со стельками, чтобы защитить стопу. Ведь когда мы ходим, то постоянно имеем точку соприкосновения с поверхностью, а при беге присутствует только элемент падения и приземления. Получается многократное сотрясение тазобедренных, голеностопных, коленных суставов. Именно поэтому стоит очень ответственно подходить к выбору обуви. Очень важно также правильно выбрать место для бега. Сразу скажу, что асфальт — неподходящее место. Бегать вдоль трасс и дорог ни в коем случае нельзя, так как происходит вдыхание вредных веществ. И тогда уже неизвестно, чего больше от этих занятий — пользы или вреда...

Сегодня практически в каждом фитнес-центре имеется тренажер "беговая дорожка". Там под присмотром грамотного специалиста, конечно, можно заниматься бегом.

В какое время суток лучше всего бегать? На этот вопрос нет однозначного ответа. Все зависит от самого человека. Если он жаворонок, и может бегать по утрам — пожалуйста. Возможно, у кого-то пик активности наступает вечером. Хотя бег поздним вечером может вызвать бессонницу. Здесь нужен индивидуальный подход.

Я бы рекомендовала заменить бег быстрой ходьбой. Это идеальный вариант. Ведь ходьбой могут заниматься практически все.

Тем, кто продолжает бегать, несмотря на нецелесообразность этих занятий, можно посоветовать следующее. Во-первых, нужно бегать по мягкой поверхности. Во-вторых, нагрузка должна быть пропорциональна физическому развитию и выносливости. И не забывайте, что к каждому случаю нужно подходить индивидуально. Кому-то бег идет на пользу, а кому-то может причинить только вред...

Дмитрий БОБРОВСКИЙ.

МЕДДАВЕДКА

Вас «залячылі»?

Асацыяцыя беларускіх медыкаў, праваабарончы цэнтр "Вясна" і Асамблея няўрадавых дэмакратычных арганізацый, незарэгістраваная ў Беларусі, склалі брашуру "Правы пацыента. Малы даведнік". У ім падрабязна, са спасылкамі на беларускае заканадаўства тлумачыцца, якія правы маюць пацыенты, а якія — урачы.

Што рабіць, калі вас не абслугоўваюць у паліклініцы альбо вы звярнуліся ў платны медыцынскі цэнтр, а вам аказалі няякасную дапамогу? Даведнік дае адказы на гэтыя і іншыя пытанні. Некаторыя вытрымкі з брашуры мы прапаноўваем нашым чытачам.

Вам адмаўляюць у паліклінічнай дапамозе

Ніхто не можа забараніць вам карыстацца паслугамі бліжэйшай паліклінікі. Дзеля гэтага трэба толькі напісаць заяву на імя галоўнага ўрача паліклінікі з просьбай аб часовым прымацаванні вас да гэтай лячэбнай установы. У выпадку ўзнікнення праблем можна спасылацца на артыкулы 5 і 6 пастановы Міністэрства аховы здароўя РБ №29 ад 10.06.2002 "Аб парадку аказання медыцынскай дапамогі грамадзянам РБ па-за межамі месца жыхарства". Тое самае датычыцца і стаматалагічнай дапамогі (акрамя зубапратэзавання).

Паміж пацыентам і платным медцэнтрам узнікла спрэчка

Асноўны дакумент, які вызначае парадак рэгулявання спрэчак, — заключаная дамова. Таму яшчэ раз нагадваем: уважліва чытайце дамову!

У выпадку невыканання дзяржаўнай арганізацыяй аховы здароўя тэрмінаў ажыццяўлення платных медыцынскіх паслуг, спажывец мае права па ўласным выбары (калі іншае не пазначана ў дамове):

— даць згоду на новы тэрмін аказання паслугі;

— патрабаваць выканання платнай паслугі іншым спецыялістам;

— патрабаваць выплаты няўстойкі ў парадку і памеры, вызначаных дамовай;

— скасаваць дамову і запатрабаваць кампенсацыі страт у судовым парадку.

Калі ў выніку невыканання альбо неналежнага выканання ўмоў дамовы была нанесена шкода жыццю альбо здароўю пацыента, ён мае права патрабаваць кампенсацыі страт, а таксама маральнай шкоды ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Як абараніць свае правы

Паводле арт.29 Закона "Аб ахове здароўя" пацыент мае права на абскарджанне пастаўленага дыягназу, выкарыстаных метадаў даследавання і лячэння, арганізацыі аказання медыцынскай дапамогі ва ўстаноўленым парадку.

Абарона правоў пацыентаў можа ажыццяўляцца ў некалькі этапаў.

Першы этап — падаць скаргу. Паводле "Тыповых правілаў унутранага распарадку арганізацыі аховы здароўя для пацыентаў", а таксама Закона РБ "Аб зваротах грамадзян" скарга падаецца ў пісьмовым выглядзе ў 2 асобніках: першы — сакратару галоўнага ўрача ці непасрэдна галоўнаму ўрачу альбо ягонаму намесніку, а другі асобнік застаецца ў пацыента ці ягонага законнага прадстаўніка. На гэтым асобніку абавязкова павінен быць (гэтага трэба патрабаваць!) подпіс сакратара (з указаннем уваходзячага нумару) ці подпіс галоўнага ўрача (з указаннем даты (часу) падачы скаргі). Скарга павінна ўтрымліваць канкрэтную інфармацыю, пытанні і патрабаванні павінны быць дакладна сфармуляваныя. Таксама абавязкова павінны быць пазначаныя імя і прозвішча грамадзяніна, даныя пра месца працы (вучобы), подпіс асобы, якая падае скаргу, дата. Калі маюцца пацвярджальныя дакументы, яны павінны быць прыкладзеныя (пералік прыкладзеных дакументаў даецца напрыканцы скаргі).

Зварот мусіць быць разгледжаны не пазней за 1 месяц з дня паступлення, а калі ён не патрабуе дадатковага вывучэння і праверкі — не пазней 15 дзён, калі іншае не прадугледжана законам.

На гэтым этапе можна прапанаваць медыцынскай установе вырашыць справу мірам і выплаціць грашовую кампенсацыю нанесенай шкоды здароўю і маральнай шкоды. Але трэба быць гатовым, што пацыенту хутчэй за ўсё адмовяць у задавальненні ягоных патрабаванняў міравым пагадненнем.

Другі этап — зварот у вышэйстаячыя інстанцыі. Гэтай інстанцыяй можа быць аддзел аховы здароўя адміністрацыі раёна горада, аддзел ці ўпраўленне аховы здароўя гарвыканкама (у Мінску — Камітэт па ахове здароўя), упраўленне аховы здароўя аблвыканкама, Міністэрства аховы здароўя і г.д.

Трэці этап — судовы. Калі іншыя сродкі абароны правоў вычарпаныя, застаецца зварот у суд з іскам аб кампенсацыі шкоды, нанесенай здароўю, маральнай шкоды і (альбо) заробку (даходу), страчанага ў выніку пашкоджання здароўя. Калі справа датычыцца нядобрасумленнага альбо няякаснага платнага лячэння, натуральна патрабаваць і спагнання самога кошту медыцынскай паслугі. На гэтым этапе цяжка абысціся без дапамогі кваліфікаваных юрыстаў ці праваабаронцаў, паколькі тут існуюць вельмі строгія, устаноўленыя грамадзянскім заканадаўствам працэсуальныя патрабаванні.

У крымінальным заканадаўстве існуе шэраг артыкулаў, па якіх могуць быць прыцягнуты да адказнасці медыцынскія супрацоўнікі пры грубым парушэнні імі сваіх абавязкаў і нанясенні шкоды здароўю пацыентаў. Гэта арт.161 "Неаказанне дапамогі хвораму" і арт.162 "Неналежнае выкананне прафесійных абавязкаў медыцынскім супрацоўнікам".

Калі вы лічыце, што сталі ахвярай "медыцынскага" злачынства, можаце звярнуцца ў пракуратуру з заявай аб правядзенні пракурорскай праверкі альбо ўзбуджэнні крымінальнай справы. Прыцягненне вінаватых да крымінальнай адказнасці не пазбаўляе ахвяру нядобрасумленнага лячэння магчымасці патрабаваць кампенсацыі ў грамадзянска-прававым парадку — дазваляецца сумяшчаць гэтыя два шляхі абароны сваіх правоў. Тут істотна адрозніваць, што суб'ектам крымінальнай адказнасці можа быць толькі фізічная асоба (доктар, іншы медыцынскі работнік), а суб'ектам грамадзянскай адказнасці (які можа выплаціць кампенсацыю) — як фізічная асоба, так і асоба юрыдычная (шпіталь, паліклініка і г. д.).

ЦЫТАТА ТЫДНЯ

Аляксандр КОСІНЕЦ, віцэ-прэм'ер Беларусі:

— У краіне не хапае 4260 урачоў. Зроблены захады для павелічэння прыёму абітурыентаў у медыцынскія ВНУ. У наступным годзе ён будзе павялічаны за кошт бюджэту на 2100 чалавек. І не менш за палову ад гэтага будуць прынятыя на пазабюджэтныя месцы. Але ліквідацыя дэфіцыту ўрачоў будзе дасягнута толькі да 2013 года".

ТЫМ ЧАСАМ

Медсёстры стануць дактарамі?

Праблему недахопу тэрапеўтаў Мінздраў спрабуе вырашыць такім незвычайным чынам.

Недахоп урачоў асабліва адчуваецца ў паліклініках. Прычына такой з'явы вядомая — медыкаў не задавальняюць заробкі, не адэкватныя іх працы, таму яны ў паліклініку і не рвуцца. Па нарматывах забяспечанасці ўрачамі агульнай практыкі, участковымі тэрапеўтамі і педыятрамі, адзін урач павінен абслугоўваць 1300 жыхароў. Аднак сёння, прызналася начальнік Упраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Людміла Жылевіч, паліклінікі ўкамплектаваны толькі на 30—60 працэнтаў. А ўрачы тым не менш павінны аказаць дапамогу ўсім пацыентам. "Фактычна ўрач абслугоўвае 3500—4000 чалавек", — зазначыла Людміла Жылевіч.

Чыноўнікі Камітэта аховы здароўя Мінгарвыканкама прыдумалі, як вырашыць гэтую праблему. Яны загаварылі аб павышэнні прафесійнага статусу ўчастковых медсясцёр. На думку чыноўнікаў, менавіта яны маглі б самастойна прымаць хранічна хворых, браць на сябе частку наведванняў на хаце і рэгуляваць выдачу талонаў. Мінздраў, напэўна, ідэю падтрымаў. Ва ўсякім разе Людміла Жылевіч заявіла, што меры, распрацаваныя сталічным Камітэтам па ахове здароўя, "павысяць матывацыю ўчастковых урачоў і медсясцёр".

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

Алег ЛОЙКА

Новыя вершы

Прызнанне

Народу свайму ўслугуючы…

Васіль Цяпінскі.

Не слуга! Не ўслугуючы,
Жыць, аднак, не магу.
Душою душы чуючы,
Прад кожнаю ў даўгу,
Як і прад кветкай, і дрэвам,
Збуцвелай ад раскі вадой,
Прад гістарычным Крэвам,
Чарнобыля бядой.

А думкаю як не гушкаць
Пчалінку і салаўя,
Калі слугаваць я мушу,
Калі я — гэта я.
Слугаваць, не раўнуючы,
Волату, чараўніку,
Цешыцца, услугуючы,
Падаючы руку —

Насуперак паняверцы —
Згарчэлай ад слёз расе,
Спакутавалага сэрца
Спагадзе, любові, красе.

З майго, аднак, слугавання
Пчолы раёў не зраяць,
Калі Беларусь хто паганіць,
Песні яе — удвая.
А я — я ж слуга і песні,
Светлых шляхоў і цяжкіх.
Іх незычлівец, чэзні!
Мой не табе кяліх.
Блазнаце не даруючы,
Я горда нясу галаву,
Народу свайму ўслугуючы,
Дыхаю, мыслю, жыву!..

Хілю перад вамі галовы

Хілю перад вамі галовы,
Хлеб-соль несучы на сталы,
Сыны Беларусі новай —
Будучыні арлы.

Як і прад вамі, варкочы —
Купалінскія сцяжкі,
Што янычаравым вочам
Ланцугом цяжкім.

Пакутую, што не рынуў
Звярадняў перамагчы,
І вось на сыне сына
Бізун гуляе ўначы,

Шалее, о, як шалее,
Ніколі так не шалеў:

Святочныя алеі
У акрэсцінскі гоніць хлеў;

Меркі дзе, паняверцы,
На ганьбу яе, хто згугнеў?!.
Рву з немых грудзяў сэрца,
Агольваю праведны гнеў
І пакаяння цунамі
Папам рымскім на здзіў:
Быў бы я колісь вамі, —
Вас бы бізун не ксціў,

Мае вы сыноў сыночкі,
Дочанечкі мае
У абдымках чорнае ночкі,
Што нас бізуном дастае!..

АД РЭДАКЦЫІ

Апошнім часам наш даўні сябра і аўтар, вядомы пісьменнік і літаратуразнаўца Алег Лойка, на вялікі жаль, пакутуе ад цяжкай хваробы. Вось і цяпер зноў ён трапіў у бальніцу…

Але светлыя душэўныя сілы, нязводны творчы дух і вера ў Беларусь дапамагаюць яму адольваць боль і не выпускаць з рук пяра. Аб гэтым сведчаць яго новыя допісы ў "Народную волю".

Шчыра зычым шаноўнаму Алегу Антонавічу хутчэйшага выздараўлення і доўгага-доўгага творчага жыцця, чалавечай радасці і ўдзячнасці чытачоў!

ЭКСКЛЮЗІЎ

Дакота — значыць крэпасць

Ужо стала добрай традыцыяй, што ў разнастайных расійскіх музычных конкурсах бяруць удзел беларусы. За апошнія гады, дзякуючы ўдзелу ў "Народным артысце" ды "Фабрыцы зорак" на эстрадзе заявілі пра сябе нашы ***Наталля Падольская, Руслан Аляхно, Вера Карэтнікава.***

У мінулым годзе на "Фабрыцы зорак" перамог мінчанін ***Дзмітрый Калдун.*** *Сёлета ў гэтым праекце ўзяла ўдзел 17-гадовая сталічная школьніца* ***Маргарыта Герасімовіч,*** *якая ўдзельнічае ў конкурсе пад псеўданімам Дакота. Дзяўчына паспяхова дайшла да фіналу.*

Ці ўдасца прадстаўніцы Беларусі выйграць у гэтым праекце, мы даведаемся літаральна праз некалькі дзён. 9 снежня адбудзецца фінальны канцэрт "Фабрыкі зорак".

Карэспандэнт "Народнай волі" расшукаў маці Дакоты — ***Святлану Герасімовіч,*** *якая падрабязна расказала аб беларускай удзельніцы "Фабрыкі зорак".*

— Калі Маргарыта была зусім маленькай і не ўмела гаварыць, а толькі навучылася вымаўляць нейкія гукі, яна ўжо спявала, — расказвае Святлана. — Гэтыя гукі выліваліся ў зусім простыя матыўчыкі. Так што можна сказаць, што спявала Маргарыта з самага нараджэння.

— Значыць, вы даволі рана зразумелі, што дачку чакае музычная кар'ера?

— Так. Пасталеўшы, яна заўжды цікавілася разнастайнымі музычнымі праектамі, у тым ліку і беларускімі. У 15-гадовым узросце Маргарыта спрабавала свае сілы ў праекце "Зорны дыліжанс". Ва ўмовах конкурсу было сказана, што ўдзел у ім могуць браць спевакі ад 15 да 30 гадоў, але Маргарыта туды не трапіла. Ёй прама ў вочы сказалі, што яна яшчэ вельмі маладая і яе час яшчэ наперадзе.

— Ведаю, што Маргарыта сама піша тэксты песень на рускай, беларускай і англійскай мовах. Да таго ж яна сачыняе музыку…

— Першы верш яна напісала ў тры гады. Тэкст там быў такі: *"Стойкий маленький солдат так стоит, что все лежат…"* Што да музыкі, то Маргарыта скончыла музычную школу. Яна піяністка. А першую сур'ёзную кампазіцыю дачка напісала, калі ёй было гадоў 10. Гэта было прысвячэнне лепшай сяброўцы.

— А як Маргарыта прыняла рашэнне паспрабаваць свае сілы ў адборы на "Фабрыцы зорак"?

— Вырашыла і ўсё. Яна мне сказала: "Мама, я веру ў свае сілы, таму і паеду. А ты мне альбо дапаможаш, альбо не перашкаджай".

— Вы, зразумела, дачку падтрымалі…

— Канешне. Хаця вельмі за яе перажывала. Баялася, што калі дачка не трапіць на праект, то для яе гэта будзе моцнай псіхалагічнай траўмай. Праўда, Рыта ўпэўнена адказала: "Калі і паплачу, то роўна адзін дзень. А потым пайду па жыцці далей".

— Пасля таго, як Маргарыта трапіла на "Фабрыку", у яе, напэўна, здалі нервы… Маю на ўвазе выпадак, калі яна нецэнзурна вылаялася, а на наступны дзень пра гэта ў інтэрнеце пісалі на ўсіх форумах…

— Быў такі непрыемны выпадак. Гэта ў самым пачатку "Фабрыкі" было. Многія з удзельнікаў дазвалялі сабе выкарыстоўваць вострыя словы… Я, канечне, дачку ругала. Патлумачыла, што ні пры якіх умовах яна не павінна выкарыстоўваць брудныя словы. Непрыгожа гэта для дзяўчыны, тым больш і ў рускай, і ў беларускай мовах дастаткова слоў, каб нармальна выказаць свае эмоцыі. Дарэчы, як вы ведаеце, 9 снежня адбудзецца фінал "Фабрыкі зорак". Напярэдадні фіналу абстаноўка, прама скажам там напружаная. Я нядаўна была ў дачкі ў Маскве, таму і ведаю. Аднак з усіх канфліктных сітуацый Маргарыта выходзіць з гонарам. Мне за яе не сорамна.

— Маргарыта заканчвае школу з лінгвістычным ухілам. Святлана, ці расказвала дачка, куды збіраецца паступаць, з якой прафесіяй збіраецца звязаць жыццё?

— Дачка вучыцца вельмі добра. У лінгвістычнай школе, дзе яна займаецца, паглыблена выкладаюцца англійская і нямецкая мовы. Гэтыя прадметы ёй падабаюцца. Маргарыта ішла на медаль. Аднак у восьмым класе яна атрымала па матэматыцы васьмёрку… Па натуры Маргарыта — гуманітарый. Дакладныя навукі ёй таксама даюцца, але крыху цяжэй.

У дачкі дзве мары — яна хоча стаць рэжысёрам, каб здымаць кліпы і фільмы. А таксама Маргарыта марыць навучыцца прафесійнай камп'ютэрнай аранжыроўцы, каб самастойна рабіць аранжыроўкі — такія, якія яна хоча. Хаця аранжыроўкі Валерыя Меладзе, якія зроблены на яе песні, проста цудоўныя…

— Дарэчы пра Меладзе. У інтэрнеце была інфармацыя, што Маргарыта падпісала з ім кантракт. Называлася нават сума ў 150 тысяч долараў…

— Гэта лухта! Ніякага кантракта Маргарыта не падпісвала. Гэтага не можа быць без майго ўдзелу, бо дачка яшчэ непаўнагадовая.

— Святлана, раскажыце, як Маргарыта выбрала сабе сцэнічны псеўданім. Чаму яна вырашыла стаць Дакотай?

— Яна доўга шукала псеўданім. Дачка сказала адразу, што Маргарытай Герасімовіч яна на сцэне не будзе — вельмі будзённа. Яна доўга шукала, і ў рэшце рэшт натыркнулася ці то ў інтэрнеце, ці то ў літаратуры на гэтае слова — Дакота. У партугальскай мове гэтае азначае "незвычайная, шматгранная, рознабаковая". А яшчэ гэтае слова з нейкай замежнай мовы перакладаецца як "крэпасць".

— Святлана, а ці ёсць у Маргарыты хлопец?

— Ёсць. Толькі яна не хоча гэтую інфармацыю разгалошваць… Добры хлопец, іграе ў хард-кор-гурце, сам піша музыку. Але галоўнае — ён вельмі добры чалавек. Калі дачка апынулася ў няпростай сітуацыі, ён адразу прыйшоў на дапамогу.

— Як бы ні скончылася "Фабрыка" для Маргарыты, яна будзе павінна яшчэ пэўны час ездзіць з канцэртамі па розных гарадах. Вы як маці гатовы да таго, што будзеце бачыць дачку ўрыўкамі…

— А што рабіць? Такія ўмовы праекта. Мы ведалі, на што ідзём…

Віталь ГАРБУЗАЎ.

КОЛОНКА ЮРИСТА

На вопросы читателей "Народной воли" отвечает юрист ***Олег ВОЛЧЕК***

К вам стучится КГБ

В рубрику "Колонка юриста" приходит много писем от родителей молодых людей, которые учатся в Вильнюсе в Европейском гуманитарном университете и в Польше по студенческой программе им.К.Калиновского. Они просят дать совет, как быть, когда к ним домой приходят сотрудники КГБ и других правоохранительных структур, требуя повлиять на своих детей. В некоторых случаях люди в погонах прибегали к прямому шантажу и угрозам. Особенно много сигналов поступало этой осенью. И в самом деле, что делать молодым людям и их родителям, когда к ним в дверь стучится КГБ? Поясняет ведущий рубрики "Колонка юриста" Олег Волчек:

— Действительно, в последние полгода сотрудники КГБ практически в каждом регионе страны проводят беседы со студентами, которые учатся за рубежом. Как себя вести в такой ситуации?

Вас вызывают в КГБ

Помните! Все действия сотрудников правоохранительных органов должны быть в рамках закона. Если вас приглашают в ведомство, для этого должно быть официальное приглашение в виде повестки. В ней должно быть указано: кто, когда, куда, по какому вопросу и в качестве кого приглашается.

Беседа — это не процессуальная форма общения граждан с должностными лицами, она не определена нормативными актами как обязанность гражданина явиться в КГБ. Гражданин может заявить, что он не желает беседовать с сотрудниками правоохранительных органов. Если должностное лицо получит такой отказ, он не сможет принудительно доставить данного гражданина, поскольку в Уголовно-процессуальном кодексе нет понятия "беседа", и неявка на подобную беседу не будет нести никакой юридической ответственности.

Если же вам пришла повестка от сотрудника КГБ, МВД, прокуратуры, то необходимо явиться туда в указанное время. Желательно прийти с адвокатом или другим своим представителем. Если гражданину в этом отказывают, то он имеет право не давать никаких показаний (ст.27 Конституции РБ: "Никто не должен принуждаться к даче показаний и объяснений против самого себя, членов своей семьи, близких родственников"). Согласно ст. 62 Конституции Беларуси, каждый гражданин в любой момент может воспользоваться услугами адвоката или своего представителя (отец, мать, сестра, брат, а также другие лица, которые могут оказать юридическую помощь). Ваш представитель будет гарантией от провокационных действий (запугивания, угроз, шантажа) со стороны следователя.

Во время допроса в качестве свидетеля, подозреваемого или потерпевшего составляется протокол. Чтобы убедиться, а есть ли вообще какой-либо материал проверки, гражданин может смело попросить у следователя или оперативного работника представить тот документ, на основании которого его вызвали для дачи объяснения.

Неприкосновенность жилища гражданина

Второй момент. Никто не имеет права без законного основания войти в жилище и иное законное владение гражданина против его воли. Под жилищем понимается не только личная квартира, но и его дом со всеми постройками на земельном участке, а также временное жилище (общежитие, гостиница, съемная квартира).

1.В соответствии со ст.210 УПК РБ, обыск может быть произведен с санкции прокурора. Основанием для его проведения является наличие достаточных данных, что в данном помещении находятся орудия преступления, документы, которые могут иметь значение для уголовного дела.

2.Если сотрудники милиции звонят и просят войти в ваш дом, вы можете не впускать их, если они не предоставляют на это санкцию прокурора.

3.В некоторых чрезвычайных ситуациях (например, когда человек кричит о помощи в доме или когда милиция преследует кого-либо) сотрудники милиции могут войти и обыскать ваш дом без санкции прокурора. Требуйте составления протокола обыска, внимательно следите за всеми действиями сотрудников милиции.

Что такое личный досмотр?

Личный обыск гражданина проводится, если он подозревается или обвиняется в причастности к уголовному преступлению (ст.211 УПК РБ). В любых других случаях гражданин имеет право отказать в досмотре его личных вещей.

Протокол личного досмотра составляется при личном присутствии задержанного и понятых. Сотрудник милиции обязан предъявить его задержанному для ознакомления и подписания. Задержанный должен его прочесть. Если у него нет возражений, он его подписывает, затем подписывают понятые и составитель протокола. Если в этом документе имеются пробелы или пустые места, необходимо поставить прочерки ручкой. Если есть другие нарушения (при досмотре не было понятых, не указана фамилия сотрудника милиции и т.п.), то он вправе сделать запись об этом в протокол. С этого момента такой протокол в дальнейшем не будет иметь доказательной силы при рассмотрении дела. При изъятии у задержанного вещей или отдельных предметов может составляться отдельный протокол. Сотрудник милиции обязан четко описать вещи и документы, которые подлежат изъятию, в присутствии понятых. Задержанному выдается копия протокола.

Вырежи и сохрани

Несколько основных правил, которые необходимо знать

1). К представителям правоохранительных органов вы должны являться только по повесткам.

2). Вы имеете право ознакомиться со ВСЕМИ материалами проверки.

3). Вы имеете право не давать показания против самого себя, ссылаясь на ст.27 Конституции РБ.

4). Вы имеете право прийти на допрос с адвокатом или другим своим представителем.

5). Если вас приглашают на какую-то профилактическую беседу, которая, естественно, не оформляется протоколом, то никакой ответственности вы не несете.

6). Давать показания вы можете, если в правоохранительных органах есть материал проверки или в отношении вас возбуждено уголовное дело.

7). Если ваши права нарушены незаконными действиями должностного лица, вы имеете право подать жалобу, которая будет рассмотрена в течение десяти дней, прокурору или в суд.

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

Не спазніцеся!

З-за розных клопатаў не заўважаем, як імкліва бягуць дні. Глядзіш — і развітаемся са снежнем.

Не спазніцеся, шаноўныя, з **перадаплатай** за нумары першай паловы 2008 года.

У чарговы раз паўтараем: мінчане могуць аператыўна зрабіць **перадаплату** праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: 328-63-93 ці 328-68-71. Пасля званка да Вас прыйдуць нашы валанцёры са свежымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць **перадаплату** за любы тэрмін.

Нягледзячы на экстрэмальныя ўмовы выдання газеты, тарыфы па **перадаплаце** ранейшыя: на месяц — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм. Заўважым: паколькі кошт газеты пры рэалізацыі ў розніцу з новага года павысіцца, то выгадна зрабіць **перадаплату** за ўсё паўгоддзе альбо за пэўны перыяд: месяц, два, тры…

Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

Вымушаны і на гэты раз звярнуць увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую **АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ,** узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары.

Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для тых, хто рабіць гэта будзе ўпершыню, не вельмі прыемная рэч. Але што зробіш: каб своечасова атрымліваць газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

Вы — з «Народнай воляй», «Народная воля» — з Вамі!

0402280179
ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за ноябрь, декабрь 2007 г., январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2008 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за ноябрь, декабрь 2007 г., январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2008 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

КВИТАНЦИЯ

Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операции по уплате налогов

Абонентская карточка

на номера газеты «Народная воля»
за ноябрь, декабрь 2007 г.,
за январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2008 г.
(ненужное зачеркнуть)

Заполняется отчетливо ***печатными буквами и обязательно*** *отправляется в редакцию с* ***копией платежного документа***

фамилия

имя **отч.**

индекс почтового отделения

область

район

название населенного пункта

город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)

улица
пр-т
переулок *(нужное — подчеркнуть)*

дом *а,б,в,г* **корп.** **кв.**

(Примечание: в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 328-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 328-69-04, 328-69-06.
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info
Індэкс 63222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай.
Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.).
Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 5.12.2007 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 11 000 экз. Заказ №